І.І. Бамбешка (Мінск)

# ГІСТОРЫКА-КРАЯЗНАЎЧАЕ ВЫВУЧЭННЕ АРШАНШЧЫНЫ Ў 1920-Я гг.

Сярод шматлікіх пытанняў, якія паўсталі перад Беларуссю пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі, было ўсебаковае вывучэнне ўсяго комплексу грамадскага і эканамічнага жыцця краіны, прыродных умоў, сацыяльнай структуры грамадства, гісторыі народа, яго мовы, быту і культуры. У гэты працэс акрамя дзяржаўных устаноў уключыліся і краязнаўцы. На тэрыторыі Віцебшчыны актыўна працавалі Аршанскае, Полацкае і Віцебскія акруговыя таварыствы краязнаўства і шэраг раённых.

Аршанскае акруговае таварыства краязнаўства было ўтворана 23 ліпеня 1924 года па ініцыятыве настаўнікаў і студэнтаў аршанскага рабфаку.

Адным з першых крокаў па арганізацыі гісторыка-краязнаўчага вывучэння было стварэнне ў тым жа годзе культурна-гістарычнага музея, куды перадаваліся разнастайныя прадметы, важныя для дакументавання працэсаў і з'яў, якія адбываліся на тэрыторыі Аршаншчыны і самой Оршы.

У пачатку 1925 года Аршанскае акруговае таварыства краязнаўства пачало рэгістрацыю ўсіх помнікаў старажытнасці, якія захаваліся на тэрыторыі акругі. Праца па анкетах Навукова-экспертнай камісіі Інбелкульта дазволіла аршанскім краязнаўцам у перыяд да верасня 1926 года на адрас названай установы даслаць 7 паведамленняў на вышэйзгаданую тэматыку, што было значна больш, чым у іншых акруговых таварыствах. Да канца года было зарэгістравана больш за 10 курганаў і гарадзішчаў, руіны аднаго замка, 5 замчышчаў, 10 цэркваў і кляштараў [14, с. 63; 13, с. 68]. У далейшым былі апісаны помнікі старажытнасці г. Оршы (рэшткі Аршанскага замка, «акопы Пятра Вялікага», будынкі Аршанскага Куцеінскага Богаяўленскага мужчынскага і Куцеінскага Успенскага жаночага манастыроў, Аршанскіх манастыроў бернардзінцаў, базыльян, дамініканцаў, францысканцаў, трынітарыяў, Аршанскага езуіцкага калегіума, а таксама будынкі Ільінскай і Мікалаеўскай цэркваў, яўрэйскай сінагогі), м. Смальняны і Пячэрская царква ў в. Дубкі. Пералічаныя помнікі былі ўзяты на ўлік Прэзідыумам акруговага выканкама і СНК БССР [1, с. 54].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адначасова краязнаўцы вялі работу па складанні археалагічнай карты акругі ў адпаведнасці з патрабаваннямі гісторыка-археалагічнай камісіі Інбелкульта. Сабраны матэрыял па дадзенай тэме быў сістэматызаваны ў артыкулах старшыні акруговага таварыства Д.М. Васілеўскага, якія былі апублікаваны ў часопісе «Наш край». У артыкулах аўтар даваў пералік і падрабязнае апісанне ўсіх выяўленых помнікаў старажытнасці ў Аршанскай акрузе па раёнах (Аршанскім, Талачынскім, Круглянскім, Горацкім, Коханаўскім, Дубровенскім, Дрыбінскім), суправаджаючы інфармацыю ілюстрацыямі [5, 6].

Значныя вынікі дала праца таварыства ў адпаведнасці з апублікаванай у краязнаўчым зборніку «Віцебшчына» ў 1925 годзе праграмай М.В. Мялешкі аб зборы звестак аб каменных помніках, якія маюць гісторыка-археалагічнае значэнне. Пад час даследаванняў ва ўрочышчы Вярба каля Дрыбіна былі выяўлены камяні з надпісамі, а ў маёнтку Смаляны Коханаўскага раёна — каменныя бабы [2, с. 24].

У сярэдзіне мая 1926 года сябрамі Аршанскага акруговага краязнаўчага таварыства быў выяўлены ўваход у пячоры ў мясцовасці Дубкі, якая знаходзілася за 1,5 км ад Оршы. Краязнаўцы самастойна агледзелі пячоры і па выніках першапачатковага абследавання склалі схематычны план. Затым яны звярнуліся ў Інбелкульт за дапамогай для правядзення далейшага вывучэння. Было прынята рашэнне накіраваць туды экспедыцыю ў складзе сяброў гісторыка-археалагічнай камісіі Інбелкульта. У чэрвені 1926 года членамі экспедыцыі Інбелкульта былі зроблены фотаздымкі, складзена падрабязная карта-план пячор, праведзена апытанне мясцовых жыхароў. Аднак вынікі абследавання былі вельмі нязначныя: не было знойдзена ніякіх сведчанняў аб паходжанні пячор, аб часе і мэце іх стварэння, аб іх выкарыстанні. Уся сабраная інфармацыя аб аршанскіх пячорах была выкладзена ў артыкуле-справаздачы ўдзельніка названай экспедыцыі Д.І. Даўгялы [10, с. 45-50].

Па ініцыятыве этнографа-археалагічнай секцыі Інбелкультура ў 1927 годзе быў створаны археалагічны заказнік па ахове і вывучэнні кurганоў каля в. Чаркасава Межаўскага сельсавета Аршанскай акругі [9, с. 100]. Пад ахову быў узяты і маёнтак Друцк са старажытным замчышчам [1, с. 54].Туды нават была здзейснена навуковая экспедыцыя супрацоўніка ІБК А.Ю. Аніхоўскага [12, с. 59].

У 1929 годзе новыя матэрыялы аб помніках гісторыі і культуры Аршаншчыны, сабраныя таварыствам да гэтага часу, увайшлі ў

чарговы артыкул Д.М. Васілеўскага [8]. У артыкуле прапаноўваліся маршруты для правядзення культурна-гістарычных і прамыслова-эканамічных экскурсій па Оршы і Аршанскай акрузе. Аўтар паведамляў некаторыя гістарычныя звесткі пра той ці іншы экскурсійны аб'ект у Оршы.

У 1920-я гады назіраецца выключная цікавасць да населеных пунктаў і іх гісторыі. Гэта тэма была надзвычай актуальнай і для Беларусі, аб чым сведчылі шматлікія анкеты, інструкцыі і праграмы, змешчаныя як у агульнарэспубліканскіх выданнях, так і рэгіянальных. Асноўным заданнем для краязнаўчых таварыстваў рознага ўзроўню, па вызначэнні І Усебеларускага краязнаўчага з'езда, павінна было стаць манаграфічнае апісанне паселішча.

На пасяджэнні Аршанскага акруговага таварыства краязнаўства ў 1926 годзе старшыня таварыства Д. М. Васілеўскі выступаў з дакладам «З гісторыі Воршы» [4]. Невялікі па памерах артыкул змяшчаў шмат цікавай інфармацыі, часам у нязвыклай для нас трактоўцы. У артыкуле прыводзяцца факты, якія паказваюць ролю Оршы ў пашырэнні каталіцкай рэакцыі на ўсход, з аднаго боку, і з другога боку — станаўленне тут асяродка асветы і змагання ўсходніх беларускіх брацтваў з націскам каталіцызму.

Яшчэ на адным са сходаў таго ж таварыства прагучаў даклад «Орша ад XI да XVIII ст.». Сябрамі названага таварыства вывучалася гісторыя Горы-Горак і Талачына Аршанскай акругі [12, с. 59; 1, с. 55–56].

Вывучэнне такой шматаспектнай тэмы, як гісторыі народанасельніцтва і яе крыніцазнаўчай базы, пачалося яшчэ да рэвалюцыі 1917 года і ў 1920-я гады стала заўважальным накірункам у гістарычным краязнаўстве. Неабходнасць вывучэння гісторыі і асноўных дэмаграфічных рысаў сучаснага насельніцтва адзначалася на І і ІІ краязнаўчых канферэнцыях СССР і РСФСР [16, с. 44]. Дадзеную праблему прапаноўвалася разглядаць у трох кірунках: колькасць насельніцтва, сацыяльны і этнічны склад, міграцыі і іншыя пытанні.

Спецыяльна пытанні гісторыі народанасельніцтва не абмяркоўваліся на краязнаўчых канферэнцыях і з'ездах у БССР, але яны ўваходзілі ў праблемнае кола нацыянальных камісій і секцый у складзе Інбелкульта і краязнаўчых арганізацый. Шматнацыянальнасць Беларусі рабіла гэтыя даследаваннямі надзвычай актуальнымі. Так, ужо ў 1926 годзе Аршанскім акруговым тавары-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ствам краязнаўства пачалося вывучэнне гісторыі кампактнага пражывання яўрэяў і яўрэйскіх земляробчых калоній на Аршаншчыне, збіраліся рэшткі «старажытнай культуры яўрэяў на Аршанчыне» [1, с. 55–56; 14, с. 63–64].

Вывучэнне рэвалюцыйнага мінулага і распрацоўка пытанняў яго крыніцазнаўства стала адной з дамінантных тэм гістарычнага краязнаўства ў 1920–30-я гады. Ужо ў 1923 годзе вядомы дзяржаўны дзеяч Беларусі З. Жылуновіч у часопісе «Полымя» звяртаўся да беларускай грамадскасці з заклікам вывучаць гісторыю рэвалюцыйнага мінулага – «Пара пісаць гісторыю рэвалюцыі» [11].

У 1926 годзе ў Аршанскім акруговым таварыстве мясцовыя краязнаўцы далучыліся да вывучэння рэвалюцыйнага мінулага. Сумесна з Аршанскай акруговай камісіяй па ўшанаванні 20-годдзя рэвалюцыі 1905 годзе быў падрыхтаваны і выдадзены зборнік «1905 год на Аршаншчыне» [15]. Вялася таксама праца па зборы фальклорых крыніц аб паўстанні 1863 года Планавалася, што назапашаныя матэрыялы ўвойдуць у зборнік «1863 год на Аршаншчыне», аднак па невядомай прычыне ён так не быў выдадзены. Тым не менш сабраны матэрыял дазволіў сябру таварыства Д. М. Васілеўскаму падрыхтаваць артыкул «Сялянства Віцебскай і Магілёўскай губерань у паўстанні 1863 г.» [7]. Аўтар заўважаў, што калі ўдзел у паўстанні шляхты пакінуў у гістарыяграфіі больш значны след, то ўдзел сялянства застаўся па-за ўвагай даследчыкаў. Разам з тым згаданыя падзеі «зрабілі моцны ўплыў на свядомасць вёскі <...> У вёсцы зарадзілася патрэба ўявіць сабе гэткае гістарычнае дзіва і растлумачыць другім, за што змагаліся і клалі <...> свае галовы тыя сяляне, што з голымі рукамі лезьлі лавіць па лясох узброенага пана» [7, с. 149]. Даследчык адзначаў, што дадзеныя падзеі пакінулі ў сялянскай памяці значны адбітак і сталі асновай для розных паданняў, песняў, прыказак, жартаўлівых прыпевак і іншага фальклорнага матэрыялу. Пералічаныя фальклорныя крыніцы пры адсутнасці пісьмовых сведчанняў аб названых падзеях могуць стаць важнымі гістарычнымі крыніцамі пры вывучэнні ўдзелу сялянства ў паўстанні 1863 года. Д.М. Васілеўскі звяртаў увагу, што пры супастаўленні фальклорных крыніц з іншымі ёсць магчымасць выявіць настроі сялян да «пана-паўстанца» і растлумачыць незразумелыя паводзіны сялян у часы паўстання. Суаднясенне фальклорных крыніц з дакументамі з архіваў дазволіла высвятліць, што сялянская памяць захавала ход падзей у межах тагачаснай

Аршаншчыны. Аўтар паспрабаваў прааналізаваць эканамічную сітуацыю ў вёсках азначаных рэгіёнаў Беларусі напярэдадні паўстання, у пачатку паўстання, удзел сялян у паўстанні, адносіны сялян да «паноў-паўстанцаў» і гэтак далей.

У 1920-я гады ў асобную галіну можна вылучыць даследаванні, прысвечаныя вывучэнню выдавецкай справы і друку ў пэўнай мясцовасці. Разгортванне падобных даследаванняў было ініцыіравана падрыхтоўкай да святкавання 400-годдзя беларускага друку. Адным з першых звярнуўся да гэтай праблематыкі адзін з актыўных краязнаўцаў БССР Д.М. Васілеўскі. У сваім артыкуле «З гісторыі Аршанскага друку» аўтар сцвярджае, што друкарская справа на Аршаншчыне шырока разгарнулася толькі ў першай палове XVII стагоддзя дзякуючы манахам Куцеінскага манастыра. Тут жа аўтар даваў агляд яго выдавецкай дзейнасці і выданняў. Акрамя таго, Д.М. Васілеўскі пералічваў перыядычныя і неперыядычныя выданні краю, якія з'явіліся ўжо ў паслярэвалюцыйны перыяд [3].

Такім чынам, падводзячы вынікі адзначым, што асноўная тэматыка гісторыка-краязнаўчых даследаванняў кожнага краязнаўчага таварыства вызначалася на ўсебеларускіх краязнаўчых канферэнцыях і з'ездах. Асноўным транслятарам і папулярызатарам краязнаўчых ідэй быў часопіс «Наш край», на старонках якога друкаваліся ўсе тэарэтычна-метадычныя выкладкі, развагі і артыкулы, а таксама інструкцыйна-праграмны матэрыял, які і акрэсліваў накірункі практычных дзеянняў мясцовых даследчыкаў. Такімі асноўнымі тэмамі сталі выяўленне, ахова і вывучэнне ўсяго комплексу гісторыка-культурнай спадчыны, распрацоўка гісторыі паселішчаў рознай катэгорыі (гарадоў, мястэчак і вёсак), вывучэнне рэвалюцыйнага мінулага і г. д.

Аршанскае акруговае таварыства краязнаўства адно з нямногіх разгарнула шырокую дзейнасць па комплекснаму гісторыка-культурнаму вывучэнню сваёй тэрыторыі. Прычым гэта дзейнасць дастаткова шырока асвятлялася ў перыядычным рэспубліканскім друку.

*Літаратура і крыніцы*

1. Аршанская акруговая краязнаўчая конфэрэнцыя // Наш край.— 1928. – № 4. – С. 53 – 56.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. Аршаншчына: [Зборнік: у 3 ч.] / Аршан. акр. т-ва краязнаўства. — Орша: Газ. «Кам. шлях», 1926. — Ч. 1: Геалагічная пабудова: флора акругі. — 34 с.
3. Васілеўскі, Д.М. З гісторыі Аршанскага друку / Д.М. Васілеўскі // Наш край. — 1927. — № 6—7. — С. 76 — 80.
4. Васілеўскі, Д. З гісторыі Воршы / Д. Васілеўскі // Наш край. — 1926. — № 2—3. — С. 53 — 54.
5. Васілеўскі, Д. З матар'ялаў да археолёгічнай карты Аршанскае акругі / Д. Васілеўскі // Наш край. — 1926. — № 4—5. — С. 64 — 67.
6. Васілеўскі, Д. Помнікі старасьветчыны на Аршаншчыне / Д. Васілеўскі // Наш край. — 1927. — №2. — С. 40 — 44.
7. Васілеўскі, Д. Сялянства Віцебскай і Магілеўскай губерань у паўстанні 1863 г. / Д. Васілеўскі // Полымя. — 1928. — № 6. — С. 148 — 161.
8. Васілеўскі, Д. Экскурсійныя аб'екты Аршаншчыны / Д. Васілеўскі // Наш край. — 1929. — № 4. — С. 16 — 21.
9. Вяргей, В.С. Дзейнасць краязнаўчых арганізацый у 20-я гг. па археалагічнаму вывучэнню БССР / В.С. Вяргей // Весці АН БССР. Сер. грам. навук. — 1979. — № 1. — С. 98 — 104.
10. Даўгяла, Д.І. Аршанскія пячоры / Д.І. Даўгяла // Наш край. — 1926. — № 8 — 9. — С. 45 — 50.
11. Жылуновіч, З. Пара пісаць гісторыю рэволюцыі / З. Жылуновіч // Полымя. — 1923. — № 5—6. — С. 89 — 91.
12. Краязнаўчая праца па акругах // Наш край. — 1927. — № 3. — С. 59 — 62.
13. Пашыраны Пленум Цэнтральнага Бюро краязнаўства // Наш край. — 1926. — № 8 — 9. — С. 65 — 68.
14. 3-я Аршанская акруговая краязнаўчая конфэрэнцыя // Наш край. — 1927. — № 2. — С. 63—65.
15. 1905 г. на Аршаншчыне. — Орша : Выд-ва газеты «Камуністычны шлях», 1926. — 105 с.
16. Филимонов, С. Б. Вопросы исторического краеведения на всероссийских и всесоюзных краеведческих конференциях 1920-х гг. / С. Б. Филимонов // Историческое краеведение в СССР: вопросы теории и практики: сб. ст. / АН Украины, ин-т истории Украины и др.; редкол.: П.Т. Тронько (отв. ред) [и др.]. — Киев, 1991. — С. 41 — 48.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ